# АБ ВЫНІКАХ VIII РЭСПУБЛІКАНСКАГА КОНКУРСУ «БІБЛІЯТЭКА — АСЯРОДАК НАЦЫЯНАЛЬНАЙ КУЛЬТУРЫ» ЗА 1999 ГОД

*Загад міністра культуры Рэспублікі Беларусь ад 13.05.2000 г. № 140*

З мэтай павышэння ролі бібліятэк рэспублікі ў адраджэнні нацыянальнай культуры Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь сумесна з Беларускім фондам культуры штогод праводзяць рэспубліканскі конкурс "Бібліятэка — асяродак нацыянальнай культуры".

У сувязі з падвядзеннем вынікаў конкурсу за 1999 г.

ЗАГАДВАЮ:

1. Прэміраваць наступныя бібліятэкі:

Дзяржынскую цэнтральную раённую бібліятэку Мінскай вобласці (дырэктар Ж.А.Галякевіч) — 125 тыс. руб.;

Стаўбцоўскую цэнтральную раённую бібліятэку Мінскай вобласці (дырэктар І.М.Кулікоўская) — 125 тыс. руб.;

Сектар краязнаўства Пінскай цэнтральнай гарадской бібліятэкі Брэсцкай вобласці (загадчык В.П.Кудзеліч) — 25 тыс. руб.;

Гальшанскую сельскую дзіцячую бібліятэку Ашмянскай РЦБС Гродзенскай вобласці (загадчык В.С.Лабуніна) — 50 тыс. руб.;

Агарэвіцкую сельскую бібліятэку Ганцавіцкай РЦБС Брэсцкай вобласці (загадчык В.М.Халецкая) — 25 тыс. руб.;

Агародня-Гомельскую сельскую бібліятэку Добрушскай РЦБС





Гомельскай вобласці (бібліятэкар Я.К.Руднікава) — 25 тыс. руб.;

Валодзькаўскую сельскую бібліятэку-клуб Докшыцкай РЦБС Віцебскай вобласці (загадчык Н.А.Шорах) — 25 тыс. руб.;

Івянецкую гарпасялковую бібліятэку Валожынскай РЦБС Мінскай вобласці (загадчык Л.Г.Башура) — 25 тыс. руб.;

Трабскую сельскую бібліятэку Іўеўскай РЦБС Гродзенскай вобласці

Будынак Агародня-Гомельскай сельскай бібліятэкі.

Помнік архітэктуры, пабудаваны жыхаром сяла Рыгорам Кобызевым у 1886 г.

Стаўбцоўская цэнтральная раённая бібліятэка Мінскай вобласці.

Сустрэча з Аленай Кубрынай — майстрам роспісу па дрэву.



(загадчык Н.А.Аляшкевіч) — 25 тыс. руб.

2. Прэміраваць бібліятэчных спецыялістаў па намінацыях:

за значны ўклад у выхаваўчую работу з падрастаючым пакаленнем бібліятэкара І катэгорыі Пружанскай раённай дзіцячай бібліятэкі Брэсцкай вобласці В.Я.Матысюк — 50 тыс. руб.;

за навацыі ў галіне бібліятэчнай справы загадчыка аддзела бібліятэчнага маркетынгу Талачынскай цэнтральнай раённай бібліятэкі Віцебскай вобласці С.М.Васкоўскую — 50 тыс. руб.;

за пошукавую і даследчую працу па напісанню гісторыі бібліятэкі загадчыка Грыбінскай сельскай бібліятэкі Круглянскай РЦБС Магілёўскай вобласці Н.В.Ярковіч — 50 тыс. руб.

3. Эканамічнаму ўпраўленню (Н.М.Казімірская) забяспечыць фінансаванне выдаткаў на прэміраванне пераможцаў конкурсу.

4. Кантроль за выкананнем загада ўскласці на намесніка міністра культуры Рэспублікі Беларусь В.К.Гедройца.